# Што такое свабода?

**“Свабода — галоўная маральная і фізычная каштоўнасьць, якая дадзеная кожнай жывой істоце ад нараджэньня”.**

*Васіль Быкаў*

---

**“Мы ня можам чакаць, што ад дэспатызму да свабоды нас перанясуць на пярыне”.**

*Томас Джэфэрсан, трэці прэзыдэнт ЗША*

---

**“Самае вялікае рабства — не валодаючы свабодай, лічыць сябе свабодным”.**

*Гётэ, нямецкі пісьменьнік, філёзаф*

---

**“Тыя, хто гатовы аддаць сваю свабоду, каб набыць нетрывалую абарону ад небясьпекі, не заслугоўвае ні свабоды, ні бясьпекі”.**

*Бэнджамін Франклін, амэрыканскі палітык*

---

**“Ніхто ня можа быць зусім свабодным, пакуль усе не свабодныя”.**

*Гэрбэрт Спэнсэр, ангельскі філёзаф*

---

**“Чалавечаму грамадзтву неабходная інтэлектуальная свабода — свабода атрыманьня і распаўсюду інфармацыі, свабода бесстароньняга бязстрашнага абмеркаваньня, свабода ад ціску аўтарытэту і забабонаў. Такая трайная свабода думкі — адзіная гарантыя ад заражэньня народу масавымі мітамі, якія ў руках вераломных крывадушнікаў-дэмагогаў лёгка пераўтвараюцца ў крывавую дыктатуру”.**

*Андрэй Сахараў*

---

**“Калі свабода зьнікла, яшчэ застаецца краіна, але Айчыны ўжо няма”.**

*Франсуа Шатобрыян, французскі пісьменьнік*

---

**“Званьне свабоднага чалавека даражэй за ўсё”.**

*Эўрыпід, старажытнагрэцкі паэт, драматург*

---

**“Ня ўсе тыя свабодныя, хто сьмяецца над сваімі ланцугамі”.**

*Готгальд Лесінг, нямецкі публіцыст, драматург*

---

**“Добра робяць толькі тое, што робяць у свабодзе”.**

*Шарль Монтэск’е, французскі філёзаф, пісьменьнік*

---

**“Свабода азначае адказнасьць. Вось чаму большасьць людзей баіцца свабоды”.**

*Бэрнард Шоу, ангельскі драматург*

---

**“Свабода — гэта ўсьвядомленая неабходнасьць”.**

*Фрыдрых Энгельс, нямецкі мысьляр, грамадзкі дзяяч*

---

**“Свабода ў сапраўднасьці і азначае заўсёдны выбар паміж альтэрнатывамі і, што яшчэ важней, свабодны выбар патрабуе стварэньня новых альтэрнатываў... але заўсёды існуе пэўны кошт свабоды — высілкі, рызыка, трывога. Нежаданьне плаціць гэты кошт і робіць людзей несвабоднымі”.**

*Рымантас Кочунас, летувіскі навуковец, прафэсар*

---

**“Дзе Дух Гасподні, там свабода”.**

*Апостол Павал*

---

**“Хто шукае ў свабодзе што-небудзь, акрамя самой свабоды, створаны для рабства”.**

*Алексіс де Таквіль, французскі сацыёляг, гісторык і палітык*

---

**“Чалавек раб таму, што свабода цяжкая, рабства ж лёгкае”.**

*Мікалай Бярдзяеў, расейскі філёзаф*

---

**“Свабода задушаная і зноў здабытая супраціўляецца больш зацята, чым свабода, якой ніколі нічога не пагражала”.**

*Цыцэрон, старажытнарымскі палітык, філёзаф*

---

**“Свабода — гэта чарадзейная лямпа; калі чалавек кранае яе з этычным захапленьнем, дык для яго ўзьнікае Бог”.**

*Сэрэн К’еркегор, дацкі філёзаф*

---

**“Ня можа быць вольным народ, які прыгнятае іншыя народы. Сіла, патрэбная яму для падаўленьня іншага народу, у рэшце рэшт заўсёды зварочваецца супраць яго самога”.**

*Фрыдрых Энгельс, нямецкі мысьляр, грамадзкі дзяяч*

---

**“Чалавек асуджаны на свабоду”.**

*Жан Поль Сартр, французскі філёзаф, пісьменьнік*

---

**“Толькі той варты жыцьця і свабоды, хто штодня за іх ідзе на бой”.**

*Ёган Гётэ, нямецкі пісьменьнік, філёзаф*

© www.za-svabodu.org